# СТАНАЎЛЕННЕ НАВУКІ Ў БЕЛАРУСІ Ў 20-Я ГАДЫ ХХ СТАГОДДЗЯ

*Лявоненка Ю. І., Ляшко М.С.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Янкоўскі Ю. Ю. – выкладчык*

Разглядаецца станаўленне беларускай савецкай навукі ў 1920-я гг. у кантэксце палітыкі беларусізацыі, нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва і развіцця вышэйшай адукацыі ў гэты перыяд.

З усталяваннем савецкай улады на Беларусі пачаўся працэс фарміравання новай сістэмы адукацыі і навукі. 1920-я гады ў БССР адзначаны правядзеннем беларусізацыі – палітыкі нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Асноўныя накірункі беларусізацыі былі заснаваны на ідэях беларускага нацыянальнага руху, які пачынаўся як культурна-этнаграфічны, з акцэнтам на вывучэнні мовы, культуры, гістарычнага мінулага беларусаў.

Галоўнай задачай развіцця нацыянальнай культуры ў 20-я гг. стала ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. У 1920 г., на момант заканчэння грамадзянскай вайны, у БССР на 1000 чалавек прыходзілася 673 непісьменных. У тым жа годзе пры Наркамаце асветы БССР была створана Рэспубліканская надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці, якая мела свае аддзяленні ў акругах і валасцях.

У БССР працэс фарміравання новай сістэмы адукацыі праходзіў паспяхова і спрыяў развіццю нацыянальнай культуры, гарманічна спалучаючыся з палітыкай беларусізацыі. [1]

У 1919 г. у БССР быў адкрыты Горацкі сельскагаспадарчы інстытут для падрыхтоўкі спецыялістаў у сельскай гаспадарцы. У 1921 г. адкрыўся Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, які ў пачатку 20-х гадоў навучаў пераважна мяшчанскіх і купецкіх дзяцей. З 1929 па 1934 гг. праводзіліся спецнаборы з рабочага і сялянскага асяроддзя, для падрыхтоўкі якіх ствараліся рабочыя факультэты (рабфакі). [2]

Вострая патрэба ў спецыялістах прывяла да выкарыстання брыгадна-лабараторнага метаду падрыхтоўкі, што зніжала якасць ведаў, але дазволіла сістэме адукацыі ў Усходняй Беларусі дасягнуць сярэднееўрапейскага ўзроўню за даваеннае дваццацігоддзе.

У 1920-я гады ў БССР ствараліся ўмовы для падрыхтоўкі нацыянальных кадраў праз тры тыпы навучальных устаноў: прафесійна-тэхнічныя школы, тэхнікумы і інстытуты. Адкрываліся навучальныя ўстановы розных напрамкаў: сельскагаспадарчыя, індустрыяльна-тэхнічныя, педагагічныя, медыцынскія, эканамічныя, музычныя і мастацкія.

Цэнтрам падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі стаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, адкрыты ў 1921 годзе ў Мінску пад кіраўніцтвам рэктара У.І. Пічэты. У снежні таго ж года з'явіўся Беларускі палітэхнічны інстытут, а ў 1922 годзе на яго базе быў створаны інстытут сельскай і лясной гаспадаркі. У 1924 годзе ў Віцебску пачаў працу ветэрынарны інстытут. [3]

Стварэнне сеткі вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў у БССР спрыяла арганізацыі навуковай працы ў сувязі з патрэбамі вытворчасці і адраджэннем беларускай культуры. У 1921 годзе была створана Навукова-тэрміналагічная камісія для распрацоўкі беларускай тэрміналогіі і выдання падручнікаў, а ў 30 студзеня 1922 годзе на яе аснове быў адкрыты Інстытут беларускай культуры, які стаў галоўнай навуковай установай рэспублікі. Згодна з палажэннем 1924 года ён абвяшчаўся вышэйшай дзяржаўнай навуковай установай рэспублікі, асноўнымі задачамі якой зяўляліся арганізацыя вывучэння грамадскіх навук і каардынацыя ўсёй навуковай работы ў БССР.

Навукова-даследчая праца ў Інбелкульце ахоплівала гуманітарныя (слоўнікавая, тэрміналагічная, літаратурная, этнаграфічная камісіі) і прыродазнаўчыя кірункі. Геолагаглебазнаўчая камісія і Цэнтральнае бюро краязнаўства стварылі сетку краязнаўчых таварыстваў па ўсёй Беларусі. У 1926 г. Інстытут беларускай культуры быў вылучаны са складу Наркамата асветы і рэарганізаваны ў дзяржаўную навукова-даследчую ўстанову пры Савеце Народных Камісараў БССР. У 1927 годзе Інбелкульт атрымаў новы статут, які дазваляў выбар сваіх членаў і стварыў Прэзідыум для кіравання дзейнасцю. Да канца 1928 года ў розных структурах Інбелкульта працавала 113 штатных супрацоўнікаў. 13 кастрычніка 1928 года ён быў рэарганізаваны ў Акадэмію навук БССР, якая афіцыйна адкрылася 1 студзеня 1929 года і стала галоўным цэнтрам навуковых даследаванняў Беларусі.

Сярод акадэмікаў, якія стаялі ля вытокаў Акадэміі навук БССР, былі вядомыя беларускія вучоныя і дзеячы культуры, такія як глебазнавец Я. Афанасьеў, мовазнаўца Я. Лёсік, паэт І. Луцэвіч (Янка Купала), гісторыкі У. Ігнатоўскі і В. Ластоўскі. Таксама звання акадэмікаў былі ўдастоены замежныя вучоныя, напрыклад, расійскі геолаг А. Карпінскі і украінскі мікрабіёлаг Д. Забалотны. Першым прэзідэнтам Акадэміі стаў У. Ігнатоўскі. Навуковая дзейнасць працягнула развівацца ў розных

напрамках, ствараліся інстытуты і цэнтры, што садзейнічала сістэматычнай і маштабнай арганізацыі даследаванняў у Беларусі. Гэта паспрыяла ўмацаванню яе ролі ў грамадскім і эканамічным развіцці. У 1927 г. ў БССР была створана Галоўнавука Наркамата асветы для рэалізацыі дзяржаўнай навукова-тэхнічнай стратэгіі. Навука стала часткай агульнадзяржаўнага планавання, спрыяючы індустрыялізацыі, рэканструкцыі народнай гаспадаркі і маштабным зменам у культурнай сферы. [4]

Беларускі навукова-даследчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі, які пачаў дзейнічаць з 1 студзеня 1927 года пад кіраўніцтвам Г. Гарэцкага, зрабіў значны ўклад у навуковыя даследаванні. Сярод прыцягнутых да працы даследчыкаў былі прафесары У. Адамаў, А. Дубах, А. Кайгародаў і У. Шкатэлаў. Інстытут правёў шмат экспедыцыйных абследаванняў і выдаў некалькі тамоў навуковых запісак. Упершыню ў СССР тут пачалі даследаванні па свінагадоўлі, стварыўшы спецыяльную доследную станцыю, а таксама другую ў СССР бульбяную станцыю.

У 1929 г. быў створаны Інстытут прамысловасці, які займаўся вывучэннем прыродных рэсурсаў і аказваў прадпрыемствам дапамогу ў рацыяналізацыі вытворчасці.

1 студзеня 1929 г. адкрылася Беларуская Акадэмія навук, утвораная на базе Інстытута беларускай культуры. Першым прэзідэнтам стаў У. Ігнатоўскі. Сярод акадэмікаў — Я. Купала, Я. Колас, В. Ластоўскі і іншыя. Да 1931 г. Акадэмія мела 12 навукова-даследчых інстытутаў, што спрыяла развіццю навукі ў рэспубліцы.

У 1927 годзе ў БССР навуковай дзейнасцю займаліся 403 чалавекі, з якіх 40,5% даследавалі сельскую гаспадарку, 34% — грамадазнаўства, 8,6% — прыродазнаўства і матэматыку, 7,2% — ахову здароўя. Кафедры ўніверсітэтаў і акадэмій сталі асновай развіцця навукі ў рэспубліцы.

Перыяд новай эканамічнай палітыкі ў БССР характарызаваўся развіццём адукацыі, навуковых устаноў і фарміраваннем інтэлігенцыі. Палітыка беларусізацыі і падтрымка нацыянальнай культуры спрыялі ўздыму літаратуры і мастацтва, хоць гэты працэс быў складаным і супярэчлівым па прычыне ідэалагічных патрабаванняў і індывідуальных поглядаў дзеячаў культуры. У 20-х гадах у СССР і Беларусі ўзнік рэпрэсіўны механізм, які ўключаў заканадаўчую базу, судовыя і несудовыя органы, а таксама ГУЛАГ. З канца 20-х гадоў палітычныя рэпрэсіі закранулі беларускую культуру і навуку, асабліва Акадэмію навук, дзе было рэпрэсіравана 26 акадэмікаў і 6 членаў-карэспандэнтаў.

У.М. Ігнатоўскі, першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук, трапіў пад надуманыя абвінавачванні ў антыпралетарскім светапоглядзе і контррэвалюцыйнай дзейнасці. У студзені 1931 года ён быў выключаны з Кампартыі Беларусі, а 4 лютага таго ж года скончыў жыццё самагубствам. У 1990 годзе ўсе палітычныя абвінавачванні супраць яго былі знятыя.

У 1930 годзе Саўнаркам БССР выключыў з Акадэміі навук шэраг вядомых вучоных, у тым ліку Г. Гарэцкага, В. Ластоўскага і Я. Лёсіка. У 1933 годзе больш за дзесяць супрацоўнікаў былі арыштаваны за ўдзел у неіснуючай арганізацыі «Беларускі нацыянальны цэнтр». Найбольшыя страты навуковыя кадры панеслі ў 1937–1938 гг., калі па надуманых абвінавачваннях былі рэпрэсіраваны вядомыя акадэмікі, такія як Я. Афанасьеў, Д. Жылуновіч і Б. Тарашкевіч. Рэпрэсіі прывялі да закрыцця шэрагу інстытутаў і адмоўна адбіліся на развіцці навукі ў Беларусі. [5]

Навука ў 20-30-я гады XX стагоддзя ў Беларусі развівалася актыўна, дасягнуўшы сярэднееўрапейскага ўзроўню. Інстытут беларускай культуры стаў асновай для вывучэння мовы, літаратуры, гісторыі і прыроды. Аднак палітычныя рэпрэсіі 30-х гадоў значна ўскладнілі развіццё культуры і навукі, закрануўшы многіх навукоўцаў і дзеячаў мастацтва.

***Спіс выкарастанных крыніц:***

*1. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі Беларусі / Гал. рэд. С.А. Умрэйка. – Мінск: Народная асвета, 1968.*
*2. Пурышава Н. Дзяржаўная літаратурная палітыка ў БССР у 20 – я гг. // Беларускі гістарычны часопіс. – 1998. – № 3.*
*3. Нарысы гісторыі Беларусі.У 2 ч. Ч. 2 / Рэд. М.П.Касцюк, І.М. Ігнаценка; Інстытут гісторыі АНБ. – Мінск: Беларусь, 1995.*
*4. Гісторыя Беларусі: Падручнік. У 2ч. Люты 1917–2002 гг. / Рэд. Я.К. Новік, Г.С. Марцуль. – Мінск: Вышэйшая школа, 2003.*
*5. Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX стагоддзі: Матэрыялы навук.-практ. канферэнцыі (Мінск, 27–28 лютага 1998 г.). – Мінск, 1998.*